# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 18 (210) 15 снежня 1993 года, серада*


Імі ганарыцца універсітэт

## Аляксандр Грынь — будучы матэматык

Гэтага хлопца на матэматычным факультэце добра ведаюць і выкладчыкі, і студэнты. **Аляксандр Грынь**, студэнт 4 курса, заслужыў павагу і аўтарытэт сваімі добрасумленнымі адносінамі да вучобы.

«Веру ў сілу сапраўдных ведаў. А яны бяруць пачатак яшчэ ў школе. Вучыўся ў матэматычным класе ў цудоўнай настаўніцы Я. В. Яроміч (дарэчы, выпускніцы нашага універсітэта), скончыў школу з [illegible]рэбраным медалём»,— ра[illegible]звае А. Грынь.

Яго сябры-аднакурснікі жартуюць: «Якую б кнігу па матэматычнаму аналізу вы не атрымалі ў бібліятэцы, там абавязкова будзе стаяць № 726 — гэта нумар чытацкага білета А. Грыня».

Быць імянным стыпендыятам не толькі ганарова, але і вельмі адказна. Адных выдатных адзнак у вучобе недастаткова. Неабходна паказваць прыклад і ў іншых справах студэнцкага жыцця. У Аляксандра ўсе цэняць арганізатарскія здольнасці, шчырасць. На I курсе — стараста курса, затым стараста групы, член Вучонай рады універсітэта, член бібліятэчнага савета, спрабуе свае здольнасці ў навуковай працы, зведаў, што такое праца ў будаўнічым атрадзе.

З упэўнасцю можна сказаць, што пасля заканчэння універсітэта Аляксандр Грынь будзе добрым спецыялістам, бо яго веды выкладчыкі ацэньваюць толькі на «выдатна».



## Ці будзе забастоўка?

Адбылася прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў універсітэта. Склікалася яна з нагоды не зусім прыемнай — як абараніць правы выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВН[illegible] на лепшае жыццё, засцера[illegible] і ад інфляцыйных працэ[illegible]. Выходзячы з гэтых абст[illegible] была сфармулявана п[illegible]аў. «Аб калектыўнай праца[illegible]й спрэчцы галіновага прафсаюза з урадам рэспублікі і далейшых дзеяннях па адстойванню сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў работнікаў галіны».

Словам, размова ішла аб тым, падтрымаць ці не падтрымаць забастоўку, якую намячалі правесці настаўнікі рэспублікі.

З дакладам выступіў старшыня прафкама У. А. Хілюта. У абмеркаванні праблемы прынялі ўдзел І. В. Гушчын, М. А. Маталыцкі, У. М. Карчэўскі, А. І. Васкабоеў. Аднагалосна была прынята пастанова, якую мы сёння друкуем.

У. А. Хілюта выбраны дэлегатам рэспубліканскай прафсаюзнай канферэнцыі, якая адбылася 9 снежня.

Як паведаміў У. А. Хілюта, на рэспубліканскай канферэнцыі прынята рашэнне аб правядзенні агульнарэспубліканскай галіновай забастоўкі ва ўстановах адукацыі з 12 студзеня 1994 года, калі не будуць прыняты меры па задавальненню абгрунтаваных патрабаванняў прафсаюза аб карэктыроўцы заработнай платы.

**Пастанова**

**прафсаюзнай канферэнцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта**

1. Згадзіцца з ацэнкамі і вывадамі, выкладзенымі ў «Звароце да членаў прафсаюза» прэзідыума Рэспубліканскага камітэта прафсаюза і Савета па каардынацыі забастовачнага руху ва ўстановах і арганізацыях адукацыі і навукі ў сувязі з невыкананнем урадам п. 3 пастановы ВС РБ ад 5 лістапада 1992 г. аб правядзенні карэктыроўкі заработнай платы педагагічных работнікаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу.

2. Падтрымаць прапанову прэзідыума Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і Савета па каардынацыі забастовачнага руху ва ўстановах і арганізацыях адукацыі і навукі аб разгледжанні на рэспубліканскай канферэнцыі, якая мае адбыцца 9 снежня, пытання аб становішчы ў сістэме адукацыі ў сувязі з невыкананнем урадам пастановы ВС РБ аб павелічэнні заработнай платы не менш 150% ад сярэднемесячнай заработнай платы служачых у прамысловасці і прыняць удзел у агульнарэспубліканскай галіновай забастоўцы ў выпадку невыканання урадам у поўным аб´ёме п. 7 арт. 34 Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» 31 студзеня 1994 г.

3. Дазволіць льготнае падаткаабкладанне вышэйшай школе:

— цалкам скасаваць падаткі на зямлю і працоўныя рэсурсы для ВНУ;

— скасаваць падаткаабкладанне сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый, якія накіраваны на фінансаванне вышэйшай школы.

4. Даць ВНУ поўную эканамічную самастойнасць у пытаннях выкарыстання ўсіх матэрыяльных і фінансавых сродкаў, атрыманых ад гасразліковай дзейнасці.

5. Даручыць прафкаму універсітэта ўнесці ў абласны Савет народных дэпутатаў і абласны Савет аб´яднання прафсаюзаў прапановы па змяненню існуючых нарматываў пры пастаноўцы і атрыманні жылля для работнікаў вышэйшай школы.

## Як жывеш, факультэт?

**Працягваем знаёміць з факультэтамі, кафедрамі, аддзяленнямі, і службамі універсітэта. На гэты раз гаворка пойдзе пра факультэт правазнаўства і яго новае аддзяленне міжнародных эканамічных адносін. Цікавасць да яго вельмі вялікая, бо тут рыхтуюць спецыялістаў, якія будуць вельмі патрэбны нашай краіне.**

**На здымку: намеснік дэкана факультэта правазнаўства Лі Чон Ку праводзіць семінар па сусветнай эканоміцы са студэнтамі I курса.**

**(Працяг на 2-ой старонцы).**



## Віншуем!

Калектыў кафедры квантавай фізікі фізічнага факультэта віншуе выкладчыка **Віктара Юльянавіча ЛЕБЯДЗЯ** з паспяховай абаронай кандыдацкай дысертацыі і зычыць новых творчых поспехаў.

* * *

Адбылося выбранне па конкурсу: С. Ф. Мусіенка абрана на пасаду загадчыка кафедры польскай філалогіі і культуры, Н. К. Памецька прысвоена званне дацэнта кафедры беларускай мовы, У. У. Пячэрскаму прысвоена вучонае званне дацэнта кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі.

## Пра надзённыя справы

На чарговым пасяджэнні рэктарата абмеркаваны надзённыя пытанні жыцця універсітэта. Заслухана справаздача дырэктара бібліятэкі В. С. Станкевіча аб рабоце па забеспячэнню студэнтаў вучэбнай і навуковай літаратурай. Р. Я. Гайдашаў расказаў пра стан і перспектывы развіцця матэрыяльнай базы факультэта фізічнай культуры і спорту.

Начальнік вучэбнага аддзела Э. С. Ярмусік пазнаёміў членаў рэктарата з арганізацыяй работы вучэбна-дапаможнага складу факультэтаў і кафедраў.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

## Кніга па пунктуацыі

У выдавецтве універсітэта выйшла кніга «Асновы і нормы сучаснай беларускай пунктуацыі». Аўтар яе — вядомы беларускі мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук Грыгор Нікіфаравіч Клюсаў. На жаль, кніга, якую ён лічыў найкаштоўнейшым з усяго, што ён напісаў, не ўбачыла свет пры жыцці вучонага.

У кнізе даецца кароткі агляд гісторыі і тэорыі пунктуацыі, асвятляецца сістэматычны звод усіх характэрных з´яў сучаснай беларускай пунктуацыі — нарматыўных, факультатыўных і аказіянальных.

Прадмову да кнігі напісала доктар філалагічных навук, прафесар М. І. Канюшкевіч.

Разлічана кніга на шырокае кола чытачоў, якія прафесіянальна звязаны з вывучэннем беларускай літаратурнай мовы.

**В. ПАЎЛАЎ.**



# Як жывеш, факультэт?



З верасня 1993 г. на факультэце правазнаўства адкрыта аддзяленне міжнародных эканамічных адносін. **Чым жыве аддзяленне сёння?** — з гэтым пытаннем мы звярнуліся да **намесніка дэкана факультэта Лі Чон Ку.**

— На сённяшні дзень у нас на аддзяленні навучаюцца студэнты 1-2 курсаў. Распрацоўваюцца вучэбныя планы і праграмы, наладжваюцца сувязі з польскімі сябрамі ў галіне прыгранічнага супрацоўніцтва, удзельнічаем у Марозаўскім праекце па адраджэнню прадпрымальніцтва ў краінах СНД.

Якія ў нас праблемы? Не хапае на аддзяленні высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Гатовы прыцягваць да сумеснай працы з намі маладых выпускнікоў і практыкаў.

**На здымках: удзельнік канферэнцыі ў Даніі А. Лобач; студэнтка I курса В. Кірвель на семінары па сусветнай эканоміцы.**

## Пасланец універсітэта ў Даніі

Інтэрв ´ю

**20—26 верасня ў далёкім дацкім горадзе Орхус адбылася міжнародная студэнцкая канферэнцыя. Вельмі прыемна, што прадстаўляў Беларусь студэнт 2 курса аддзялення міжнародных эканамічных адносін Андрэй Лобач.**

**Прапануем увазе чытачоў расказ А. Лобача аб канферэнцыі, аб Даніі, аб уражаннях ад паездкі.**

**— Раскажы, калі ласка, аб задачах канферэнцыі, аб яе праграме.**

— Міжнародная студэнцкая канферэнцыя праводзіцца традыцыйна з 1989 года ў розных гарадах па ўсяму свету. На ўдзел у студэнцкім форуме ў Орхус прыехалі 200 чалавек з усіх краін. Упершыню ў Данію былі запрошаны прадстаўнікі Усходняй Еўропы. Фінансавалі канферэнцыю Міністэрства замежных спраў і банк.

Кожная канферэнцыя мае пэўную тэму, мэты і задачы, даная была прысвечана праблемам паўночна-усходняй Еўропы.

Кожны ўдзельнік падрыхтаваў даклад, тэмы — самыя разнастайныя: жанчына і дэмакратыя, дапамога і супрацоўніцтва, адукацыя і г. д.

Што адразу хочацца адзначыць: канферэнцыя была самастойна падрыхтавана студэнтамі без падказкі выкладчыкаў. Кіраўнікі груп — выкладчыкі толькі накіроўвалі дэбаты.

**— Андрэй, ты быў адзіным прадстаўніком краін СНД на канферэнцыі (акрамя Беларусі, былі студэнты з Прыбалтыкі). Якая роля выпала табе, з чым ты пазнаёміў слухачоў?**

— Я расказаў замежным студэнтам аб адукацыі ў Беларусі. Маналог цягнуўся 4 гадзіны (на англійскай мове). Тэма выклікала жывы інтарэс. Студэнты гаварылі аб недахопе літаратуры аб нашай краіне, літаратуры па пытаннях Усходняй Еўропы. Іх цікавіла ўсё: эканоміка і палітыка, вучоба і адпачынак студэнтаў, зарплата і многія-многія іншыя пытанні. Я прывёз з сабой шмат кніг па гісторыі Беларусі, па культуры, па прыродзе, карціны.

**— Ты меў зносіны і з англічанамі, і з амерыканцамі, з датчанамі і шведамі, ці ёсць адрозненне замежнай сістэмы адукацыі ад нашай?**

— Па-першае, універсітэт у Даніі, напрыклад, адрозніваецца ад інстытута. Універсітэт—гэта велізарная арганізацыя, якая мае сваю канстытуцыю, статут, і, галоўнае—свой студэнцкі саюз. Вельмі моцна развіты рух студэнтаў. 90 працэнтаў маладых людзей — прадстаўнікі ці члены саюза. У мяне склалася ўражанне, што студэнты — сапраўдныя гаспадары свайго дома. Кожны студэнт мае права ўзяць у дзяжурнага ключ ад любой аўдыторыі. Універсітэцкі гарадок пры клапатлівых адносінах да сябе студэнтаў — утульны, зручны. У іх распараджэнні — камп´ютары, рэстаран, бар, кафейні, кухні. Кожны студэнт надзейна абаронены з боку дзяржавы і студэнцкага саюза.

**— Ці ёсць, на тваю думку, адметныя адрозненні замежных студэнтаў ад нашых, як яны ставяцца да вучобы?**

— Самае галоўнае ў студэнта — вучоба, яны вельмі сур´ёзна ставяцца да яе. Адукацыя ў іх бясплатная. Знаходзяцца ў вучэбным корпусе з 5 гадзін ранку да 5 гадзін вечара. Кожны з іх атрымлівае стыпендыю, даволі вялікую па нашых мерках; жывуць асобна ад бацькоў, плацяць за жыллё, адкладваюць грошы на вандраванні кожны год. У бібліятэках — уся перыёдыка, няма недахопу літаратуры. Пасля заканчэння універсітэта работу шукаюць самастойна.

**— Як ты лічыш, што можна ўнесці з вопыту адукацыі ў замежных краінах канкрэтна ў наш універсітэт?**

— Студэнты, якія вучацца і адпачываюць разам, могуць зрабіць вельмі многа: развіваюцца і духоўна, і маральна, і матэрыяльна. Бо студэнцкі саюз можа арганізаваць паездкі за мяжу, выставы, пакупкі літаратуры.

Мы з групай ініцыятыўных рабят стварылі клуб студэнтаў ЮНЕСКО. Першае наша мерапрыемства — навагодняя эканамічная гульня. Мы хацелі б, каб студэнты адчулі сябе арганізатарамі, уявілі сябе ў ролі бізнесменаў (у нас будзе сваё шоу, казіно, валюта). Хацелася б, каб вечар стаў самаакупаемым, прынёс прыбытак, але галоўнае — не грошы, а тое, каб праявіліся арганізатарскія здольнасці маладых людзей, з´яднаць студэнтаў агульнай справай.

Студэнты, у асноўным, у нас пасіўныя, хацелася б іх натхніць на цікавыя справы. I курс выпусціў газету, дзе падверг справядлівай крытыцы 2 курс. Мы не пакрыўдзіліся, а, наадварот, зразумелі, што жыццё на аддзяленні забулькатала.

**З Андрэем Лобачам гутарыла Наталля БЕДЗЬ.**

В. С. Станкевіч:

## «Бібліятэка заклікана быць навуковым, культурным і метадычным цэнтрам універсітэта, аб´ядноўваць студэнтаў і выкладчыкаў».

**Універсітэцкая бібліятэка займае адметнае месца ў жыцці нашага калектыву. Усе мы карыстаемся яе паслугамі і зусім невыпадкова, што толькі ў бягучым годзе яе работа двойчы разглядалася на пасяджэннях рэктарата і Вучонай рады. Але дырэктар бібліятэкі (дарэчы, працуе на гэтай пасадзе 26 гадоў) Віктар Сцяпанавіч Станкевіч не крыўдзіцца: усё гэта на карысць справе.**

**Наша размова з ім менавіта аб месцы бібліятэкі ў жыцці універсітэта, выкананні яе калектывам функцыянальных абавязкаў, праблемах.**

— Галоўным у рабоце бібліятэкі,— гаворыць В. С. Станкевіч,— з´яўляецца задавальненне попыту на літаратуру па курсах спецыяльных і прафесійных дысцыплін. У цэлым мы забяспечаны падручнікамі і навуковай літаратурай нядрэнна: 80 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць усе неабходныя падручнікі і дапаможнікі.

Згодна з палажэннем аб камплектаванні бібліятэк ВНУ падручнікамі, добрым паказчыкам забяспечанасці лічыцца, калі ёсць адзін падручнік на трох студэнтаў. Мы так і камплектавалі раней кніжны фонд. На некаторых курсах кожнаму студэнту маглі выдаць асобны падручнік. А калі былі фінансавыя магчымасці, то бралі на кожнага студэнта нават і больш.

Цяпер сітуацыя змянілася не ў лепшы бок. Зараз мы адчуваем недахоп кніг (па прычыне іх старэння) па эканоміцы, гісторыі рэлігіі, культуры, па французскай і нямецкай мовах, грамадскіх навуках.

У той жа час адзначу, што фонд вучэбнай літаратуры папаўняецца за кошт выпускаемых нашым выдавецтвам дапаможнікаў. Гэтыя выданні вельмі патрэбны студэнтам.

Нядрэнна забяспечана бібліятэка навуковай літаратурай па курсах спецыяльных і прафесійных дысцыплін, а калі навуковай літаратуры па якой-небудзь тэматыцы не хапае, яна заказваецца па МБА. Для многіх выкладчыкаў і студэнтаў асобныя артыкулы з часопісаў і зборнікаў пераздымаюцца на ратапрынце. Да паслуг наведвальнікаў і перыядычныя выданні, якіх маем па ўсіх спецыяльнасцях. Дарэчы, па запатрабаванню Міністэрства адукацыі бібліятэкай і вучэбна-метадычным аддзелам падрыхтаваны заяўкі на перавыданне кніг, якіх недастаткова.

**— Віктар Сцяпанавіч, з Вашага расказу можа скласціся ўражанне, што ў вас няма праблем: усё ціха і гладка. Але ж не змяншаюцца чэргі ў чытальнай зале, не ўсе выходзяць з бібліятэкі задаволеныя. Не хапае месцаў у чытальнай зале. У чым справа?**

— О, праблем хоць адбаўляй, і адным разам іх не ліквідаваць. Аб цяжкасцях у забеспячэнні студэнтаў літаратурай я падрабязна гаварыў на рэктарацэ. Няма памяшкання для чытальнай залы ў вучэбным корпусе № 2, дзе знаходзяцца тры факультэты, шмат завочнікаў і платнікаў першай і другой адукацыі. Узніклі цяжкасці з атрыманнем расійскіх выданняў, якіх паступае зусім мала. Не можам перавесці грошы і за абавязковы экземпляр кнігі, які атрымліваем з маскоўскага бібкалектара. Адсутнічае інфармацыя аб выхадзе выданняў у краінах СНД. І толькі вялікімі намаганнямі супрацоўнікаў бібліятэкі пакрысе наладжваем кнігаабмен.

І яшчэ. Загадчыкам кафедр і выкладчыкам неабходна вельмі адказна падыходзіць да заказаў літаратуры па тэматычных планах выдавецтваў. Неверагодна, але некаторыя выкладчыкі кафедр фізічнага і інжынернага факультэтаў не ведаюць, якая літаратура ёсць у бібліятэцы, не рэкамендуюць яе студэнтам. Яны не рэагуюць на просьбы нашых работнікаў даць нам спісы рэкамендуемай літаратуры. На сумны лад наводзіць і той факт, што некаторыя выкладчыкі гадамі трымаюць у сябе дома навуковую літаратуру і не здаюць яе ў бібліятэку, а гэта прыводзіць да адмаўлення іншым чытачам.

**— Работу любой бібліятэкі з лепшага боку характарызуе яе даведачна-бібліяграфічная служба: усё павінна быць на віду, чытач за хвіліну-дзве можа выбраць патрэбную кнігу. У вас ёсць электронны каталог, але ён, відаць, не мяняе сітуацыю?**

— Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне істотна пашырана. Зараз мы выдаем самыя разнастайныя даведкі інфармацыйнага характару. Надаем увагу і прапагандзе бібліятэчных ведаў, знаёмім студэнтаў з навінкамі паступаючай літаратуры праз электронны каталог з аўтаматызаванай раздрукоўкай. Шкада, што гэтага недастаткова. Ды і не ўсе студэнты і выкладчыкі маюць жаданне працаваць з каталогамі.

**— Віктар Сцяпанавіч, некалькі слоў аб тым, як вядзецца прапаганда літаратуры?**

— Для студэнтаў мы арганізуем кніжныя выставы, бібліяграфічныя агляды, дыспуты, канферэнцыі, дні кафедр, дні дыпломніка і іншыя. Многія з іх ахвотна ўдзельнічаюць у гэтых мерапрыемствах, але аддача ад іх, я лічу, магла б быць большай. Таму нашы работнікі сарыентаваны на тое, каб разнастаіць праводзімыя сустрэчы з чытачамі.

**— А цяпер далікатнае пытанне: ці шмат хто з чытачоў губляе падручнікі, выносіць з бібліятэкі без запісу?**

— Вось гэта і з´яўляецца, бадай, галоўнай прычынай таго, што падручнікаў не хапае, іх выносяць, ці проста крадуць, як гэта непрыемна гаварыць. Студэнтаў за гэта караем. Цяпер ставім пытанне, каб браць за згубленую кнігу ў 10-разавым кошце па новых цэнах. Вельмі засмучае, што будучыя спецыялісты, у тым ліку і настаўнікі, крадуць кнігі.

**— Цікава, а як за мяжой. Няўжо таксама бяруць?**

— Я вывучаў замежны вопыт работы бібліятэк многіх краін. Там практычна кніг не крадуць, хаця фонды адкрыты, і да іх свабодны доступ. На дом падручнікі не выдаюцца, іх можна пачытаць толькі ў чытальнай зале. Да кнігі там адносяцца беражліва і з вялікай увагай.

**— А цяпер, Віктар Сцяпанавіч, дайце інфармацыю, якія падручнікі атрыманы сёлета бібліятэкай?**

— Перш за ўсё адзначу падручнікі па матэматыцы на беларускай мове, па мікрабіялогіі, філасофіі, маркетынгу, «Юрыдычная псіхалогія», «Кароткі нарыс гісторыі і права Беларусі» і інш. Зазначу, што гэта недастаткова. Супрацоўнікі робяць усе захады, каб набыць пабольш новых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў выдавецтваў Беларусі, Расіі і іншых краін, забяспечыць імі студэнтаў і выкладчыкаў. А таксама хутка абслужыць усіх чытачоў.

**Гутарыў У. АМЕЛЬКА.**

*Для вас, першакурснікі!*

# Паходжанне слоў

**Акадэмія, універсітэт, інстытут**

Слова **«акадэмія»** паходзіць ад імя міфічнага героя Акадэма, у гонар якога была названа мясцовасць паблізу Афін. У XVII ст. пры падтрымцы ўлад пачынаюць ствараццa акадэміі як навуковыя цэнтры. Гэта Англійская акадэмія (Лонданскае каралеўскае таварыства), створана ў 1660 г., Французская АН — у 1666, Пруская (у Берліне) — у 1700, Пецярбургская — у 1724-м. Акадэмія навук Беларусі адкрыта ў Мінску ў 1929 годзе.

**Універсітэты** ўзніклі ў сярэднія вякі ў гарадах, дзе ў школах былі настаўнікі, якія праславіліся сваёй вучонасцю. Менавіта для іх адусюль, у т. л. з іншых краін, збіраліся слухачы. У чужой краіне яны станавіліся бяспраўнымі і безабароннымі, вось чаму пачалі аб´ядноўвацца ў саюз-універсітэт (ад лац. «універсітэт» — сукупнасць). Сюды ўваходзілі настаўнікі, вучні, перапісчыкі кніг, прадаўцы пергаменту. Гэта было нешта накшталт асобнага цэху. Пастунова універсітэты атрымалі правы і прывілегіі ад каралёў, таму што вялікая колькасць прыезджых ажыўляла духоўнае жыццё, рамяство, гандаль. Пазней слова «універсітэт» тлумачылі ўжо не як саюз, а як сукупнасць факультэтаў. Першыя універсітэты з´явіліся ў XII — XIII ст.ст. у Італіі, Іспаніі, Францыі, Англіі.

Слова «Інстытут», як і «універсітэт», у нашай мове ўжываецца з XVIII ст., паходзіць ад лац. «інстытутум» — устаноўленне, упарадкаванне, установа. Дзеяслоў «інстытуэрэ» (ад яго і «інстытут») азначае навучаць.

**Атэстат, дыплом, канікулы**

Лац. «атэстарэ» — сведчыць, быць сведкай. Адсюль **«атэстат»**, што ў дослоўным перакладзе азначае «пасведчанне».

Ад грэч. **«дыплома»** — складзеная напалам грамата, пазней — пасведчанне пра званне, адукацыю, майстэрства, высокую якасць і г. д.

Лац. «каніс» — сабака. Рымляне словам **«Канікла»** называлі сузор´е Вялікага Пса. Так яны называлі і час, калі Сонца пры сваім руху знаходзілася ў гэтым сузор´і (з 22 ліпеня па 23 жніўня) — самыя гарачыя дні лета. На гэты час аб´яўляўся перапынак у занятках. Адсюль і назва «канікулы».

**Аўдыторыя, урок, дысцыпліна**

**«Аўдыторыя»** ідзе ад лац. «аўдзі» — слухаць, «торыюм« — памяшканне. Дослоўна: памяшканне для слухання (лекцый або дакладаў).

**«Урок»** ідзе ад ст. -руск. «реку» — гавару. Урок — гэта гаворка, гутарка, цяпер — час школьных заняткаў (звычайна 45 хв.), прысвечаны асобнаму прадмету. Гэта і навучальная работа, якую настаўнік дае вучням.

Спачатку **«дысцыпліна»** (ад лац. «дісціпліна») азначала толькі навуку, прадмет навучання. Пазней азначэнне пашырылася, слова пачало азначаць таксама строгі парадак, вытрымку, як, напрыклад, школьная дысцыпліна.

Мы сели, и лёгким пружинистым шагом,
Вращая ушами, заходит препод,
И грозно, и страшно кося левым глазом,
Он из широких штанин достаёт:
Конспект, авторучку, очки и прищепку,
Галстук, пижаму и снова очки,
Кнопку, тетрадь, канцелярскую скрепку,
Стул, микроскоп и снова очки.
Там по истории партии первый
Бабушкой наспех связанный шарф.
Три папиросы швыряет он нервно
И ложит всё это в маленький шкаф.
Мы, обалдев, открываем конспекты,
И достаём из широких штанин
Яблоко, грушу, бинокль с дефектом,
Три пулемёта и стингер один,
Двадцаць три танка, четыре танкетки,
Шесть броненосцев, потрёпаный флаг,
Две замусоленных старых конфетки
И огурцами наполненный бак.
Что же нам нужно? — Ручка, не более
Или хотя бы один карандаш.
Зубы сжимая от внутренней боли,
Нас выгоняет профессор...

* * *

К нам пришел вчерашний
школьник,
Сдав экзамен кое-как.
Согласитесь, это следать,
Скажем прямо, не пустяк.
И совсем не думал ты,
Что здесь тебя проблемы
ждут.
Но, сделав шаг
на первый курс,
Ты попал в наш тесный круг.

Ты пришёл на матфак—
Значит, ты сделал шаг
К´мудрости по знаньям
И к себе первый шаг.
На матфак, на матфак
Приглашаем мы всех,
Всех, кто верит в счастье
И в дальнейший наш успех.

На матфаке будешь счастлив,
Сдав экзамен и зачёт.
Если здесь и есть проблемы,
То всего два раза в год.

Математик — это тот,
кто верит
Даже в самый трудный час,
И тот, кто знает, что удача
Не оставит нас.

* * *

Лучше нету факультета,
Где дух алгебры живет.
Лучше нету той минуты,
Когда сессия придёт.

Как увижу я доцента,
Всё во мне заговорит...
Вся душа моя пылает,
Все лицо моё горит.

Лучше нету факультета,
Что нас всех объединил.
Лучше нету той науки,
Что Евклид нам подарил.

Как докажешь теорему,
Всё в тебе заговорит.
Вся душа твоя пылает,
Вся душа твоя горит.

Хорошо студентом быть
И на лекции ходить,
Там себе спокойно спать
И ни строчки не писать.

Букварь давно уже забыт,
И мозг от формул твой
трещит,
Пределы, суммы и ряды
Уже давно решаем мы.

Филфак по швам трещит
от слов,
Но мало умных там голов,
Я на филфак пошёл бы сам,
Но я боюсь — концы отдам.

Физфак ещё туда-сюда,
Но в общем — тоже ерунда,
И биофак давно уж сгнил,
Я видел множество могил.

Юрфак везде суёт свой нос,
Но до матфака не дорос,
Матфак — вот лучший
факультет,
И здесь не очень много бед.

Матфак уж ждёт своих
детей,
Из вас здесь сделают людей,
Сюда идите не боясь,
И в общем, даже
не крестясь!

* * *

Союз интегралов, рядов,
производных
Сплотила навеки царица наук.
Да здравствует созданный
волей преподов
Единый могучий, любимый
матфак.

Славься, Тадеуш наш
Эдвардович,—
Дружбы студентов надёжный
оплот.
Партия Можджера, партия
славная,
Нас к полученью диплома
ведёт.

Сквозь грозы сияло нам
солнце зачётов,
Но Ровба великий нам путь
озарял,
На правое дело он поднял
студентов,
Поднял, опустил
и проректором стал.

В победе бесстрашных идей
Вейерштрассе
Матфака грядущее видится
нам.
Нас к госам ведёт
бесконечная трасса,
Воспойте же славу матфака
сынам.

Дні матфака

# Вясёлы дыялог

— Стой! Дзе ты бяжыш?

— Не дзе, а навошта. Я — хіба што на лекцыю.

— Добра. З дыпламатам, у касцюме, і яшчэ бяжыць — а, гэта першамучанік, а не студэнт. Усё ж: куды ідзеш?

— Таварыш міліцыянер, я не іду — я мацую свой крок з адзінай пастаўленай мэтай. Я ўчора, 17-га, да 2 гадзін ночы быў батанікам — то на агуркі пагляджу, то на памідоры.

— Вы што, мне тут жарты строіць будзеце? Які крок, які памідор? Вуліцу патрэбна пераходзіць толькі ў вызначаных месцах, каб не парушаць парадак руху гарадскога транспарту.

— Таварыш міліцыянер, навошта рабіць пераход прамым, трэба зрабіць пераход па дыяганалі, тым больш, што ён у мяне крыж-накрыж пасля свята.

— Менш трэба гарэлку піць. У такім выпадку, студэнт Смірноў, я павінен затрымаць вас.

— Мяне? Дык я нічога дрэннага не раблю. Мы ўдваіх былі: я і сябра. Зайшлі тут недалёка ў інтэрнат. Мяркуем пасядзім, паразмаўляем шчыра. А душа ў сябра чыстая, ну амаль што самая чыстая.

Так у гаворцы яны падышлі да універсітэта.

— Таварыш студэнт, а чаму так шмат народу? Ідзе, здаецца, лекцыя.

— Відаць, так. Гэта толькі падумаць, малады чалавек ледзь ранкам абуджаецца, ледзь апранаецца, ледзь дабіраецца да універсітэта. Ну, здаецца,— на гэтым мучэнні скончаны. А вось і не: на табе па галаве навуковым молатам. Таму неабходна зайсці ў сталоўку, добра падмацавацца, глядзіш — і граніт навукі не вельмі страшэнным здаецца.

— Жахліва. І часта вы так вучыцеся?

— Я ўвогуле ранкам заўсёды выбіраю, чым мне сёння заняцца: ці на танцы завярнуць, ці ў рэстаран, ці для разнастайнасці ва універсітэт на лекцыі, калі манета завісне.

— І што, завісла?

— Ды не, стыпендыя...

— А ты не падкажаш, дзе ў вас тут туалет?

— Ёсць на першым паверсе, на другім, калі аднаго не хопіць. Пасля наведвання нашай сталоўкі такое часта здараецца.

— О, юнак, гэта я цябе сёння аблаяў?

— Так, гэта я спяшаўся на заняткі.

— А чаго ты такі худы, змучаны такі?

— Патрабаванні выкладчыкаў да мяне вельмі высокія, патрабуюць добрых трывалых ведаў.

— Ты, напэўна, выдатнік?

— Не...

— Давай твой плашч патрымаю, а то, мабыць, самому цяжка.

— Гэта не плашч, гэта мой сябра, студэнт Сідараў. Вось ён якраз выдатнік.

— Ты б спортам займаўся. Можа, трохі дужэйшы быў бы.

— А я йогу люблю.

— Ды ну!.. у цябе ж нават ногі не згінаюцца.

— Ды не, вы няправільна зразумелі. Йога — гэта мастацтва зводзіць канец стыпендыі з канцом месяца.

— А як жа ты ставішся да дзяўчат?

— О, у нас на матэматычным факультэце яны вельмі прыгожыя. Але грошы аддаю толькі адной-адзінай.

— І на якім курсе гэта шчаслівіца?

— Яна працуе ў сталоўцы касірам.

— А як экзамены здаеш, не хвалюешся?

— Экзамены мучаць кожнага, нават добра падрыхтаванага чалавека.

— Але надзею на здачу экзамена не губляеш?

— Не, я не павінен гэтага рабіць, пакуль экзаменатар не страціў самавалодання.

— Пачакай, пачакай, ты, відаць, першакурснік: у касцюме, з гальштукам — адкуль ты тады ўсё гэта ведаеш?

— У мяне брат на гэтым факультэце 8 гадоў вучыўся.

— А чаму ж так доўга? Напэўна, твой брат не меў вялікай ахвоты атрымаць дыплом.

— Мой брат дзеля заліку гатовы быў пайсці на ўсё, нават на лекцыю.

— А ці можна карыстацца канспектамі ў час экзамена?

— Вядома, толькі нельга яго выкладчыку паказваць...













**МАТЭРЫЯЛЫ ПАДРЫХТАВАЛІ:** Андрэй Садоўскі, Юрый Стасюкевіч, Мікалай Мацюкевіч, Юрый Ісакаў, Уладзімір Мазоль, Дзмітрый Рудакоў, Вадзім Арцюх, студэнты матэматычнага факультэта.

● Падзея

# Вечар спартыўнай славы

Штогод у канцы года традыцыйна праводзіцца вечар спартыўнай славы, падвядзення вынікаў выступлення лепшых спартсменаў у спартыўных форумах.

Спорт вышэйшых дасягненняў ва універсітэце заўсёды на вышыні. Тут вучыліся першая алімпійская гімнастка Алена Валчэцкая, легендарная Вольга Корбут, самы дужы чалавек планеты Аляксандр Курловіч, група барцоў грэка-рымскага стылю: Анатоль Федарэнка, Валерый Грыдзюшка, Іван Чэчка, Іван Чарныш і многія іншыя. Гэта нашы лепшыя, аб іх ішла гутарка на вечары, яны — арыентыр для маладой змены.

У гэты вечар на сустрэчу да студэнтаў і выкладчыкаў прыйшлі А. Валчэцкая — ст. выкладчык факультэта фізвыхавання, В. Максімовіч — загадчык кафедры фізвыхавання, А. Яроцкі — акадэмік, прафесар, Р. Гайдашаў — дэкан факультэта фізвыхавання, лепшыя спартсмены сённяшнага дня: С. Саладоўнікаў — футбольны бамбардзір, А. Альшэўскі — член баскетбольнай зборнай каманды, які нядаўна вярнуўся з турнэ па ЗША, прызёры першынства Еўропы і свету па барацьбе самба Ю. Лысенка і А. Багдзевіч, пераможца прэстыжных міжнародных турніраў, чэмпіён рэспублікі, удзельнік першынства свету В. Цыленць, удзельнік чэмпіяната свету, член нацыянальнай зборнай рэспублікі па лёгкай атлетыцы, майстар спорту міжнароднага класа В. Рудэнік.

Цікавая экспрэс-канферэнцыя, якая адбылася на сцэне, прайшла вельмі жыва. Рабяты шмат вандруюць па свеце: праехалі ўсю Заходнюю Еўропу, скандзінаўскія краіны, ЗША і Канаду, і ім было што расказаць студэнтам.

Сярод студэнтаў карыстаецца павагай фізічная культура і спорт. Спартакіяда універсітэта праводзілася больш як па 10 відах спорту. Галоўны суддзя спартакіяды Я. А. Роўба ў дзясяты раз ужо ўручыў кубак факультэту правазнаўства, на другім месцы — матэматычны факультэт, на трэцім — біёлагі. Студэнцкі прафкам узнагародзіў каштоўнымі падарункамі 25 лепшых спартсменаў універсітэта.

Паказальныя выступленні па акрабатыцы, грэка-рымскай барацьбе, барацьбе самба, рытмічнай гімнастыцы адчулі цёплую сустрэчу залы. Нашых спартсменаў прывітала група сучаснага танца «Сінтэз» Палаца культуры «Юнацтва», мастацкая самадзейнасць студэнтаў факультэта фізічнай культуры і тэатра «Канкан».

У спрэчцы лепшых гіравікоў універсітэта лепшым стаў Дзмітрый Коню — падняў двухпудовую гіру 40 разоў, у барацьбе на руках мацнейшым стаў К. Жук (факультэт фізвыхавання). У перацягванні каната ў вострай барацьбе з камандай фізвыхавання атрымалі перамогу студэнты інжынернага факультэта.

Заканчваецца год, яго вынікі ў спорце вядомы, будучы год абяцае быць не менш цікавым на перамогі і рэкорды спартсменаў універсітэта. І мы зноў сустрэнемся як раз праз год і раскажам пра іх.

**В. ЧЭКЕЛЬ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання, рэжысёр і вядучы вечара.**

# У хаце пахне пірагамі...

## Рыхтуемся да свята

**Набліжаюцца калядныя святы, Новы год. Усе гаспадынькі думаюць загадзя, якія падарункі зрабіць родным, як святочна ўбраць пакой, як накрыць стол. І, вядома, самае галоўнае,— чым незвычайным пачаставаць гасцей.**

**Звычайна ў гэты дзень у хаце пахне пірагамі. І ад гэтага паху становіцца ўтульна і святочна. А нехта ўздыхне, успомніўшы бабулю: «Якія пірагі яна ўмела пячы!». Можна, канешне, купіць торт у магазіне. Можна з паўфабрыкату зляпаць нешта нуднае і дзяжурнае. Але ўсё гэта будзе несапраўднае, не вашае, і, шчыра кажучы, няўменне пячы пірагі моцна падточвае рэпутацыю добрай гаспадыні.**

**Але навучыцца гэтаму вельмі нескладана. І мы вам з задавальненнем дапаможам.**

— Пачнём з простага — з пячэння. Многія, мабыць, маюць рэцэпты свайго, хатняга «фірменнага», але становяцца ў працяглую чаргу, калі прадаюць крэкеры, сухое пячэнне (што бывае вельмі рэдка).

А чаму б вам не зрабіць штонебудзь незвычайнае ў хаце? Мы дадзім два рэцэпты — з дрożджамі і без іх.

**Сухое пячэнне:**

500 г мукі, 1/2 л. солі, 30 г. дражджэй, 1 1/2 шклянкі вады ці малака, 50 г маргарына.

Насыпаць муку (пшанічную ці аржаную) ўзгоркам у місцы, у цэнтры зрабіць паглыбленне. Разбавіць дрожджы цёплым малаком (1/2 шклянкі), узбаўтаць відэльцам і выліць ў паглыбленне. Змяшаць з часткай мукі. Трэба гэта зверху пасыпаць соллю, накрыць сурвэткай і паставіць у цёплае месца да той пары, пакуль рошчына не ўдвоіцца ў аб'ёме, затым замясіць усе прадукты. Дадаць растоплены маргарын — у канцы, даць цесту яшчэ раз узняцца. Вымесіць яго добра і раскачаць у тонкі пласт. Цяпер трэба разрэзаць на квадраты, трохвугольнікі, затым выразаць кружкі чаркай, раскласці пячэнне на змазаны ліст, праткнуць некалькі разоў відэльцам і выпякаць пры тэмпературы 200°.

**Рэцэпт без дражджэй** разлічаны на такія ж прадукты, толькі вады (ці малака) трэба ўзяць крыху менш — 1 1/4 шклянкі, а маргарына — 100 г.

Муку змяшаць з соллю, дадаць ваду ці малако, растоплены маргарын, прыгатаваць крутое цеста і трымаць яго на холадзе хвілін 30—40. Затым раскатаць у тонкі пласт і зрабіць пячэнне, як з дражджавога цеста.

Згадзіцеся, што такія прысмакі нядрэнна мець у хаце кожны дзень.

А цяпер перайдзем да пірагоў. Праявіце творчасць і фантазію! Здзівіце гасцей! Вы жадаеце зрабіць дражджавы пірог і не можаце вырашыць, з якой начынкай: ёсць і капуста, і цыбуля, і мяса, і рыс. Рабіце адразу з усім. Толькі гэты пірог будзе незвычайнай формы, лепш за ўсё яго пячы ў круглай патэльні. Раздзяліце цеста на маленькія кавалачкі для піражкоў, раскатайце. На кожную аладку кладзіце якую-небудзь адну начынку, зашчыпаць бакі, надаць круглую форму пончыка і кладзіце на змазаную патэльню адна да адной. Калі патэльня запоўніцца, змазаць верх растопленым маргарынам ці сырым жаўтком і пастаўце ў духоўку. Такі ж самы пірог можна зрабіць з салодкай начынкай.

А цяпер рэцэпт **дрожджавога цеста:**

на 500 г. мукі 300 г. дражджэй, 1 1/2 шклянкі малака (можна кефіра) ці 300 смятаны, 1 яйцо, узбітае з 2-3 ст. л. цукру, 100 г растопленага маргарына, 1/4 ч. л. солі. Цеста замешваецца такім чынам: дрожджы раскрашыць, пакласці на дно невялікага слоіка, засыпаць чайнай лыжкай цукару, заліць цёплым малаком ці вадой на 1/3 слоіка, шчыльна закрыць, паставіць у цёплае месца. Муку прасеяць (інакш цесту будзе цяжка падымацца) у вялікую міску ўзгоркам, зрабіць паглыбленне. Уліць дрожджы, захопліваючы лыжкай крыху мукі, паступова ўліць падагрэтае малако, узбітае яйцо з цукрам, соль, разведзеную ў сталовай лыжцы вады. Замясіць цеста кансістэнцыі смятаны. Растоплены маргарын можна замясіць разам з усімі прадуктамі, але лепш гэта зрабіць пасля першага пад'ёму цеста — без маргарына яно паднімецца хутчэй. Накрыць сурвэткай і паставіць у цёплае месца. Калі яно паднімецца, добра вымясіць і дадаць растоплены маргарын ці масла. Паставіць яшчэ раз для пад'ёма. Затым зноў вымясіць, дадаць, калі неабходна, яшчэ мукі. Цеста не павінна быць крутым. Яно павінна быць жывым пад вашымі рукамі — і гэта вы абавязкова адчуеце. Гэта — цеста для пірагоў з несалодкай начынкай. Калі вы будзеце пячы салодкі пірог, можаце выкарыстоўваць гэтае цеста, але можна зрабіць яго больш цікавым, дадаўшы ваніль ці карыцу. Ваш салодкі пірог здзівіць гасцей, калі пры замешванні ў такое цеста вы дададзіце цэдру аднаго лімона.

Пірог можна ўпрыгожыць: заліць верх узбітымі бялкамі з цукрам, зноў паставіць у духоўку, вынуць праз 2-3 хвіліны. Можна зліць узбітай з цукрам смятанай.

Аб начынках, напэўна, гаварыць не трэба — яны могуць быць разнастайнымі. І фантазія тут не ведае межаў. Дадзім вам толькі адзін арыгінальны рэцэпт.

«Лянівая» пахлава

Цеста дрожджавае, па ва[illegible]му рэцэпту, са смятанай, з карыцай ці лімоннай цэдрай.

**Начынка:** драблёныя арэхі, разынкі, крыху змажаныя на масле, растоплены мёд. Колькасць арэхаў залежыць ад памераў пірага, а мёда патрэбна ўзяць столькі, каб ён пакрыў усю начынку, але не быў «лішнім».

Бакі пахлавы трэба добра зашчыпаць, верх змазаць сырым яйцом — і ў духоўку.

Смачна есці!

● Працягваем размову

# Як пан «спадаром» стаў

**У сродках масавай інфармацыі, асяродках беларускай інтэлігенцыі, выступленнях дзяржаўных асоб усё часцей з'яўляецца і гучыць слова «спадар». У той жа час у правінцыі яно выкарыстоўваецца рэдка. Насцярожанасць, на маю думку, тлумачыцца найперш няведаннем яго паходжання.**

**Ігнат ТРУСЕВІЧ**
**Магілёўская вобласць**

На гэты конт мной праведзена філалагічнае даследаванне, аб выніках якога і пойдзе ніжэй гаворка. Дык вось, мне даволі многа даводзілася працаваць з дарэвалюцыйнымі і пасляррэвалюцыйнымі беларускімі выданнямі, але, як ні дзіўна, ні разу ў іх не стрэлася ва ўжытку (можа, я быў недастаткова ўважлівы?) слова «спадар».

Звярнуўся да слоўніка. У 5-томны тлумачальны ўключана толькі слова «гаспадар». Былі таксама праштудзіраваны многія акадэмічныя слоўнікі: «Дыялектычны слоўнік Лоеўшчыны» (1982), «Марфемны слоўнік беларускай мовы» (1975), «Беларуска-рускі слоўнік» (1989), «Зборнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі, яе пагранічча» (1984), «Слоўнік беларускай мовы» (1987), «Слоўнік тураўскай мовы», «Слоўнік рускай мовы XI — XVII стст.» (1977, 1989), «Слоўнік Скарыны». І ўсе яны таксама ўтрымліваюць толькі «гаспадара».

Далей прагледзеў слоўнікі царкоўна-славянскай мовы выдання 1861-га, царкоўна-славянскай і рускай мовы выдання 1967 года. І тут нічога...

Нарэшце, у маіх руках аказаўся аўтарытэтны і кампетэнтны «Слоўнік беларускай мовы» І. Насовіча (1890). У яго ўключана слова «господарь», як уладальнік, уладар над сваім дабром. Акрамя таго, ідуць 13 вытворчых ад яго слоў з падрабязным тлумачэннем кожнага. Ёсць тут і словы «сподарь» (гаспадар, галава сямейства, «сподарька»).

Суадносіны гэтых адных і тых жа па зместу варыянтаў у сэнсе іх выкарыстання не ў карысць слова «сподарь». Тлумачэнне таму я знайшоў у «Слоўніку польскай мовы» (1915 г.), дзе Спадар — гэта больш ранняя форма слова Гаспадар. Яно пазначана крыжыкам як на той час адмершае, адышоўшае з выкарыстання.

Вось перада мной яшчэ «Беларуска-расейскі (Вялікалітоўска-рускі) слоўнік» доктара Я. Станкевіча, які быў выдадзены ў апошні час у Нью-Йорку. Ён ва ўсіх адносінах заслугоўвае ўвагі.

Менавіта ў слоўніку Я. Станкевіча дадзена даволі ўсебаковае тлумачэнне слову «спадар». Папершае, «спадар» — гэта «Гасподзь», «Господь» (пагадзіцеся, гэта ні ў якім разе не «господин», «пан»). Сэнс гэтага паняцця вельмі высокі. Таму тлумачэнне В. Рагойшы, што «спадар» паходзіць ад скарачэння «гаспадара», не вытрымлівае крытыкі. Слова «спадар» было зыходным, першапачатковым. Яго выкарыстанне некалі мела ўзнёслы сэнс і ўжо толькі таму было абмежаваным.

Ёсць, на мой погляд, тлумачэнне таму, што зварот «спадар» да Бога распаўсюдзіўся часткова на людзей. Паны ўсіх часоў сціпласцю не вызначаліся і не грэбавалі часам сваім празмерным узвышэнем у вачах прыгонных. Хітры ж мужык у адказ завышаў іх іерархічны статус, бо ўсведамляў, што грэх у гэтым выпадку лажыўся на панства. Згадаем, напрыклад, старадаўні анекдот:

— Ну, як тамака ваш новы пан?

— Нічога сабе, толькі бяда, што мае вушы ў нагах.

— Якім жа гэта парадкам?

— А так, калі да яго не пахілішся ажно да каленяў, нічагусенькі не чуе!

Вось так і здарылася, што ўсеўладнага пана ўзвышалі да «спадара». А каго ж мы ўзвышаем цяпер?

Ці наадварот — прыніжаем?

**Уладзімір КІСЯЛЕЎ.**
**(Газета «Рэспубліка»).**



Кветкі маме.

Фота У. САРОКІНА.

Гэта цікава

# Помнікі

У Рыме ёсць адзіны ў свеце помнік аслу. Гісторыя яго звязана з першай сусветнай вайной. Гэтая цярплівая жывёліна была адзіным надзейным «транспартным сродкам» у італьянскай арміі.

* * *

Унікальны помнік устаноўлены ў аўстралійскім горадзе Бунарга. Ён узведзены на сродкі фермераў у гонар вусеняў, якія ўратавалі горад ад зараснікаў кактусаў, супраць якіх былі бездапаможныя нават трактары і карчавальнікі.

* * *

Калі камандуючы арміяй, якая ў сярэднія стагоддзі асадзіла нямецкі горад Монсцер, убачыў на гарадской сцяне пеўня, то прыйшоў да вываду, што яго намер узяць горад морам праваліўся. І зняў асаду. На самай жа справе да таго часу ў горадзе не засталося ніякіх харчоў, і гэты певень быў апошняй «ежай». Удзячныя жыхары паставілі пеўню помнік.

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш
Зак. 5465
Тыр. 1000 экз.

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара
У. П. АМЕЛЬКА